## НА ВЫКАНАННЕ ДЗЯРЖПРАГРАМЫ ІНАВАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ Ў 2011—2015 ГАДАХ ПЛАНУЕЦЦА НАКІРАВАЦЬ КАЛЯ BR100 ТРЛН

**Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, дзе разглядаўся праект Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады, перадае БЕЛТА.**

Сродкі банкаў складуць 30,6 працэнта, уласныя сродкі арганізацый — 13,4 працэнта, замежныя інвестыцыі — 46,9 працэнта, сродкі рэспубліканскага бюджэту — 8,6 працэнта, сродкі мясцовых бюджэтаў — 0,4 працэнта.

Адкрываючы пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў, прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч адзначыў: «Праграма інавацыйнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады — гэта тая сума ідэй і прапаноў, якія дадуць магчымасць сапраўды нашай эканоміцы быць інавацыйнай».

Паводле слоў Ігара Войтава, асноўнай мэтай гэтай праграмы з'яўляецца стварэнне канкурэнтаздольнай на сусветным рынку высокатэхналагічнай эканомікі.

Рэалізацыя праграмы павінна забяспечыць перавод нацыянальнай эканомікі ў рэжым інтэнсіўнага развіцця, вырашэнне важнейшых для краіны задач па збалансаванасці эканомікі, значны рост экспарту (у 2,2 раза), трохразовы рост экспарту высокатэхналагічнай прадукцыі, вырашэнне пытанняў імпартазамяшчэння.

У рэспубліцы прапануецца стварыць эфектыўную сістэму кіравання ў сферы інавацыйнай дзейнасці з мэтай інтэгравання сектара навуковых праектных канструктарскіх інжынірынгавых даследаванняў і распрацовак з айчынным галіновым сектарам.

У сувязі з гэтым важнейшымі задачамі інавацыйнага развіцця Беларусі на бліжэйшыя 5 гадоў з'яўляюцца: стварэнне новых сектараў эканомікі, новых вытворчасцяў, рэканструкцыя і мадэрнізацыя дзейных вытворчасцяў, а таксама стварэнне новых шматпрофільных холдынгаў, кластарных структур і паскарэнне інавацыйнага развіцця рэгіёнаў. У цэлым праграма накіравана на дасягненне да канца 2015 года ўдзельнай вагі інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі на ўзроўні 20-21 працэнта, долі інавацыйна актыўных арганізацый у агульнай колькасці арганізацый — 40 працэнтаў. Унутраныя затраты на навуковыя даследаванні і распрацоўкі павінны павялічыцца да 2,9 працэнта ВУП, аб'ём экспарту навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі — з $3,1 млрд да $6,4 млрд.

Усяго праграмай намячаецца выкананне 877 праектаў па стварэнні новых прадпрыемстваў, вытворчасцяў і мадэрнізацыі дзейных вытворчасцяў. Праграма будзе складацца з праектаў пяці ўзроўняў. Пры гэтым прыярытэтнымі будуць праекты ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і космасу, фармацэўтычнай прамысловасці, медыцыны, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, энергетыкі, машынабудавання і металургіі, будаўніцтва і прамысловасці будматэрыялаў. У гэтых сферах будуць рэалізаваны буйныя структураўтваральныя інавацыйныя праекты.

## СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў БЕЛАРУСІ ДА 2015 ГОДА БУДЗЕ СКЛАДАЦЬ НЕ МЕНШ ЗА 80 ПРАЦЭНТАЎ АД СЯРЭДНЯЙ ЗАРПЛАТЫ Ў СУМЕЖНЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІНАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як адзначалася на пасяджэнні, сярэдняя зарплата ў Беларусі да 2015 года будзе складаць не менш за 80 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты ў сумежных еўрапейскіх краінах. Аднак, заўважыў прэм'ер-міністр, яе рост у гэтыя пяць гадоў павінен абавязкова быць падмацаваны іншай важнай складовай — ростам прадукцыйнасці працы. «Зарплата — гэта вытворная ад прадукцыйнасці працы, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Таму яна павінна быць заробленай». Трэба мець на ўвазе і тое, што частка зарплаты будзе ісці, у прыватнасці, на павелічэнне аб'ёму аплаты жыллёва-камунальных паслуг, якія датуюцца дзяржавай. Мяркуецца, што да канца пяцігодкі насельніцтва будзе аплачваць паслугі ЖКГ на 60 працэнтаў, а электрычнасць і газ — на 100 працэнтаў.

Паводле звестак міністра эканомікі Мікалая Снапкова, за наступныя пяць гадоў прадугледжваецца рост рэальнай зарплаты ў 1,85-1,93 раза, рост яе мінімальнага ўзроўню — не менш адной трэці ад сярэдняй зарплаты па краіне. Істотна павялічацца ў краіне і аб'ёмы будаўніцтва жылля: у 2011—2015 гадах у эксплуатацыю запланавана ўвесці не менш за 42 мільёны квадратных метраў, што на 60 працэнтаў больш, чым у папярэдняй пяцігодцы. Прычым з-за зніжэння ўзроўню затрат на будаўніцтва жылля кошт аднаго квадратнага метра да 2015 года будзе адпавядаць памеру сярэднямесячнай зарплаты ў рэспубліцы.

Каб запланаванае было рэалізавана, паводле меркавання старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча, краіне вельмі важна выйсці на станоўчае сальда знешняга гандлю. «У гэтай пяцігодцы самым важным і ключавым з'яўляецца выхад у 2015 годзе на станоўчае сальда. Калі гэты паказчык не будзе дасягнуты, то пад пагрозай могуць апынуцца ўсе астатнія планы». Ён прапанаваў устанавіць для прадпрыемстваў жорсткае патрабаванне, згодна з якім прырост экспарту павінен апераджаць прырост імпарту не менш чым на 10 працэнтаў. Калі ж яно не будзе забяспечвацца, то, паводле прапановы галоўнага банкіра, неабходна прымаць да прадпрыемства жорсткія захады. Наогул жа, Пётр Пракаповіч лічыць, што сёння склалася спрыяльная сітуацыя для развіцця эканомікі. Ён патлумачыў, што ў свеце цяпер хапае фінансавых рэсурсаў, якімі рэспубліка можа скарыстацца, зняўшы ўсе пытанні па закупцы абсталявання — дзейнічаюць крэдыты на гэтыя мэты, пераважна на льготных умовах. «Любое прадпрыемства, любая галіна можа стаць канкурэнтаздольнай за 2-3 гады, калі да гэтага адносіцца з поўнай адказнасцю», — зазначыў Пётр Пракаповіч.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### ВОЛЬНЫ ЧАС У АГНІ

**У Бялынічах 31 студзеня эвакуіравалі дзяцей і дарослых з раённага Цэнтра творчасці і вольнага часу навучэнцаў, таму што ў падвале бавілі час мужчыны з алкаголем і цыгарэтамі.**

У будынку спрацавала аўтаматычная пажарная сігналізацыя «Маланка», калі на першы паверх з падвала папоўз дым. Выратавальнікі МНС вывелі з памяшканняў 56 дзяцей і 18 супрацоўнікаў розных арганізацыяў.

У час тушэння пажару ў падвале, паведаміла прэс-служба Магілёўскага абласнога УМНС, быў знойдзены труп зваршчыка. Напярэдадні 41-гадовы мужчына рамантаваў сістэму ацяплення ў суседнім будынку, а потым з калегам уладкаваўся ў падвале Цэнтра творчасці, каб выпіць і закусіць. Цяпер спецыялісты высвятляюць усе абставіны здарэння, але верагоднай прычынай пажару называюць неасцярожнасць пры курэнні нецвярозага чалавека.

**Ілона ІВАНОВА.**

### Абзац

◢ Возера Секлы ў Браслаўскім раёне выстаўлена на таргі ў форме аўкцыёну для заключэння дагавора арэнды. Возера знаходзіцца на паўднёвым захадзе раёна ў 34 км ад райцэнтра і ў 2 км ад пасёлка Відзы. Плошча воднай паверхні складае 98 га. Тут водзяцца ляшчы, шчупакі, плоткі. Па ўмове таргоў возера будзе перададзенае ў арэнду на 10 гадоў з правам вядзення прамысловага рыбалоўства і арганізацыі платнай аматарскай лоўлі. Пачатковая цана ўстаноўлена ў Br196 тыс. Зараз у раёне арандуецца 15 рыбалоўных угоддзяў. Па Віцебскай вобласці гэтая лічба складае 180 водных аб'ектаў, якія здадзеныя 80 арандатарам. Усяго ў вобласці больш за 800 натуральных вадаёмаў.

◢ **Аматар начных аўтапрагулак разбіў чужую машыну і непрыметна вярнуў ключы ад яе гаспадару. Кампанія сяброў адзначала суботні вечар у сталічнай кватэры. 17-гадовы навучэнец мінскага ПТВ заўважыў, што гаспадар кватэры паклаў ключы ад сваіх «Жыгулёў» у кішэню штаноў. Пасля таго, як гаспадар заснуў, хлопец сцягнуў ключы і паехаў катацца па начной сталіцы. Праз 500 м ён урэзаўся ў паркан. Ён вырашыў пра інцыдэнт прамаўчаць, а ключы вярнуць на месца. Выявіўшы пашкоджаную машыну, гаспадар звярнуўся ў міліцыю. Праваахоўнікі хутка «вылічылі» вінаватага па адной дэталі, на якую не звярнуў увагі нават пацярпелы, — вінаваты пераблытаў кішэню, у якую клаў ключы.**

◢ У ноч з пятніцы на суботу недалёка ад камвольнага камбіната дзве іншамаркі засталіся без колаў. Спачатку пра крадзеж усіх чатырох колаў у міліцыю паведаміла гаспадыня аўтамашыны «Хонда-Цывік», крыху пазней з падобнай заявай у міліцыю звярнуўся ўладальнік «Аўдзі». У першым выпадку страты ацэненыя ў 1,5 мільёна рублёў, у другім — у 5 мільёнаў. Аддзелам дазнання папярэдняга расследавання Ленінскага РУУС па гэтых фактах распачатыя крымінальныя справы.

### Поўны абзац

◢ **У Днепрапятроўскім цырку ў праграме «Зоркі свету» выступае хор кракадзілаў. Правесці эксперымент з першымі ў свеце кракадзіламі, якія спяваюць, кіраўніцтва незвычайнай цыркавой праграмы вырашыла яшчэ ў 2004 годзе. Вучыць кракадзілаў даводзілася інстынктыўна. Дэманстраваць свой тэмбр алігатары пачыналі так: некалькі хвілін гучала дастаткова цяжкая музыка, у якой можна было пачуць голас кракадзіла. Далей, злавіўшы гук, адна жывёла пачынала пець, пасля чаго астатнія падхоплівалі. У канцы музыка зусім выключалася, і можна было пачуць гучнае і звонкае рыканне. У хоры 5 місісіпскіх алігатараў, сярод якіх ёсць асобіны як мужчынскага, так і жаночага полу. Спевакам у хоры ад 30 да 35 гадоў. У сярэднім гэтыя рэптыліі жывуць да ста гадоў і больш. Рэпетыцыі праходзяць штодня. У будучыні дрэсіроўшчыкі плануюць навучыць кракадзілаў, якія пяюць, яшчэ і танцаваць.**

◢ 68-гадовы Дэвід Гор з Мельбурна стаў пераможцам чэмпіянату па гульні ў покер Crown Aussie Millions Main Event 2011 і выйграў прыз у памеры 2 млн долараў. Таксама яму дастаўся інкруставаны брыльянтамі бранзалет. Гор перамог у адным з буйнейшых картачным спаборніцтве 721 суперніка, сярод якіх былі і тытулаваныя ігракі сусветнага ўзроўню. У інтэрв'ю ён расказаў, што пачаў гуляць у покер у 40-х гадах мінулага стагоддзя, калі быў дзіцем. Гор, камп'ютарны тэхнік па адукацыі, працуе ў буйной страхавой кампаніі. Нягледзячы на тое, што ўвесь мінулы тыдзень ён гуляў у карты па 12 гадзін у дзень, ніводнага працоўнага дня пажылы аўстраліец не прапусціў. Вялізны выйгрыш ён мае намер патраціць на сваіх пяцярых унукаў.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ЭКЗАМЕНЫ Ў ГІМНАЗІІ СТАНУЦЬ БОЛЬШ АБ'ЕКТЫЎНЫМІ І ПРАЗРЫСТЫМІ

**НЕ сакрэт, што многія з бацькоў лічаць паступленне свайго дзіцяці ў гімназію залогам яго паспяховай будучыні. І хоць непасрэдна гімназічная адукацыя пачынаецца толькі з пятага класа, тым не менш бацькі спрабуюць уладкаваць сваё дзіця ў першы клас абавязкова пры гімназіі: маўляў, так праз чатыры гады яму прасцей будзе стаць гімназістам. Не выключана, што раней такія захады з боку бацькоў не былі пазбаўлены сэнсу, ва ўсялякім разе ў 2010 годзе конкурс у асобныя гімназіі ў нашай краіне складаў усяго 1—1,1 чалавека на месца. Ці варта казаць, што пры такім «раскладзе» працэдура ўступных іспытаў ператваралася фактычна ва ўмоўнасць. А сярод новаспечаных гімназістаў абсалютная большасць з'яўляліся выпускнікамі пачатковай школы пры той жа навучальнай установе.**

Дарэчы, у мінулым годзе Адміністрацыяй Прэзідэнта праводзіўся маніторынг уступных выпрабаванняў у некаторых сталічных гімназіях, падчас якога было выяўлена мноства праблемных момантаў, характэрных не толькі для Мінска. Была таксама створана камісія пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, акадэміка Анатоля Рубінава, галоўная місія якой заключалася ў вывучэнні ўсіх бакоў функцыянавання гімназій на працягу навучальнага года. Падкрэслівалася, што эфектыўнасць дзейнасці гімназій залежыць ад многіх фактараў: ад арганізацыі ўступных іспытаў, парадку зацвярджэння кантрольных лічбаў прыёму, захавання канфідэнцыяльнасці экзаменацыйных матэрыялаў, аб'ектыўнасці і празрыстасці пры арганізацыі саміх выпрабаванняў, захавання адзінага падыходу да ацэньвання работ на ўступных іспытах...

А нядаўна стала вядома, што ўмовы паступлення ў гімназіі былі зменены. У прыватнасці, пачынаючы з гэтага года, прыём у гімназію будзе ажыццяўляцца як на аснове вынікаў уступных іспытаў, так і з улікам гадавых адзнак за чацвёрты клас па тых вучэбных прадметах, па якіх праводзяцца экзамены. Будучым гімназістам прыйдзецца выконваць кантрольную работу па матэматыцы і пісаць дыктоўку па беларускай і рускай мовах. Такім чынам максімальная сума балаў, якую зможа набраць вучань пры паступленні, складае 60. У Міністэрстве адукацыі ўпэўненыя, што залічэнне ў гімназію з улікам гадавых адзнак узмоцніць увагу да ўсяго адукацыйнага працэсу, а не толькі да саміх уступных выпрабаванняў. Да таго ж, чым большая колькасць адзнак, тым меншая верагоднасць у прэтэндэнтаў на званне гімназіста набраць аднолькавую колькасць балаў. Нагадаем, што раней залічэнне ў гімназіі ажыццяўлялася толькі па выніках экзаменацыйных адзнак.

Ёсць і яшчэ адно істотнае дапаўненне. Калі раней заданні для ўступных іспытаў рыхтаваліся спецыялістамі ўпраўленняў адукацыі і Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, то цяпер усё пройдзе цэнтралізавана пад кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі. Зборнікі дыктовак па рускай і беларускай мове і зборнік кантрольных работ па матэматыцы будуць выдадзены і дастаўлены ва ўстановы адукацыі ўжо ў сакавіку. З гэтых зборнікаў і будуць падбірацца тэксты па мовах, а таксама заданні па матэматыцы. А на ўпраўленні і раённыя аддзелы адукацыі будзе ўскладзена задача па захаванні канфідэнцыяльнасці заданняў пры захоўванні і дастаўцы пакетаў з варыянтамі заданняў.

Кантрольныя лічбы прыёму ў гімназіі будуць зацвярджацца на пасяджэннях выканкамаў да 10 красавіка, прычым па кожнай канкрэтнай гімназіі, і змяняць іх падчас уступных іспытаў будзе забаронена. Трэба мець на ўвазе, што, згодна з Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, напаўняльнасць у 5—11-х класах гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій-каледжаў мастацтваў не павінна перавышаць 20 навучэнцаў .

Міністэрства адукацыі накіравала ва ўпраўленні адукацыі аблвыканкамаў і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама ліст, у якім указала на недапушчэнне ўключэння ў прыёмныя камісіі настаўнікаў, якія працуюць у платных гуртках ці групах па падрыхтоўцы да паступлення ў гімназіі, а таксама настаўнікаў, якія працуюць у чацвёртых класах. Да таго ж Міністэрства адукацыі не рэкамендуе стварэнне спецыяльных курсаў для падрыхтоўкі дзяцей да паступлення ў гімназію. «Так званыя «школы падрыхтоўкі да паступлення ў гімназію» прыводзяць да неабгрунтаванага ажыятажу сярод бацькоў, а вучыць дзяцей трэба якасна перш за ўсё на ўроках», — упэўнены намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно.

У Міністэрстве адукацыі запэўніваюць, што ўсе навучэнцы пачатковых школ навучаюцца па Адзіным тыпавым вучэбным плане, адзіных вучэбны праграмах, у тым ліку і на факультатыўных занятках. Такім чынам да заканчэння чацвёртага класа навучэнцы пачатковых класаў, якія функцыянуюць як пры школах, так і пры гімназіях, атрымліваюць аднолькавы ўзровень падрыхтоўкі. А гэта азначае, што ў іх ва ўсіх — аднолькавыя стартавыя магчымасці пры паступленні ў гімназію.

Застаецца дадаць, што на сёння ў Беларусі функцыянуюць 212 гімназій (гэта 6 працэнтаў ад агульнай колькасці агульнаадукацыйных устаноў): 24 гімназіі — у Брэсцкай вобласці, 25 — у Віцебскай, 31 — у Гомельскай, 35 — у Гродзенскай, 36 — у Мінскай, 20 — у Магілёўскай і 41 — у Мінску.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## «БУДЗЕМ ПРАЦЯГВАЦЬ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ЛЕГАЛЬНЫХ ПАСТАЎШЧЫКОЎ МАБІЛЬНІКАЎ»

**ЗА мінулы год, у параўнанні з 2007 годам, было скрадзена ў два разы менш мабільных тэлефонаў. Як за такі адносна непрацяглы час атрымалася дасягнуць такіх істотных вынікаў? Аб гэтым распавёў «Звяздзе» начальнік аддзела па наглядзе за дазнаннем у органах унутраных спраў Генеральнай пракуратуры Салаўдзі МАГАМАДАЎ.**



***— Скажыце, калі ласка, чыя заслуга ў тым, што колькасць крадзяжоў тэлефонаў за чатыры гады зменшылася з 32 тысяч да 15 тысяч?***

— Па-першае, вялікую дапамогу праваахоўным органам аказалі сродкі масавай інфармацыі. Мы з экранаў тэлевізараў і са старонак газет прасілі людзей пільна сачыць за сваёй маёмасцю, асабліва ў транспарце, супермаркетах. Акрамя таго, павысілася якасць папярэдняга расследавання і, адпаведна, працэнт раскрыцця злачынстваў, звязаных з крадзяжамі мабільных тэлефонаў. Так, калі ў 2008 годзе за перапрашыўку тэлефонаў да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты два «народныя ўмельцы», то летась на лаве падсудных іх было ўжо 12. І ніводзін з іх не пазбегнуў пакарання. Напрыклад, віцябчаніну прысудзілі штраф у памеры 60 базавых велічынь, жыхара ж Мастоўскага раёна пазбавілі волі тэрмінам на два гады. Больш за тое, новыя тэлефоны, у прыватнасці смартфоны, якія сёння складаюць на рынку працэнтаў 20 ад усіх мабільных тэлефонаў, ужо не так проста паддаюцца перапраграмаванню. І па ацэнках спецыялістаў, у бліжэйшыя два-тры гады іх перапрашыўка наогул стане немагчымай.

***— А ці атрымалася дамовіцца з аператарамі мабільнай сувязі аб укараненні за іх кошт абсталявання, якое б вызначала ў сябе ў сетцы і адключала перапрашытыя і «шэрыя» (нелегальна ўвезеныя ў краіну) тэлефоны?***

— Міністэрства ўнутраных спраў цесна ўзаемадзейнічае з аператарамі сотавай сувязі. Ужо не першы год на тэрыторыі нашай краіны дзейнічае адзіная аўтаматызаваная база ўліку звестак аб скрадзеных і страчаных тэлефонах. Яе сутнасць у тым, што органы ўнутраных спраў у аўтаматычным рэжыме адсылаюць інфармацыю аб такіх тэлефонах аператарам сотавай сувязі. Тыя ж, у сваю чаргу, калі знаходзяць у сябе ў сетках такія тэлефоны па IMEI-нумарах, сігналізуюць аб гэтым. Генпракуратура, як вы правільна заўважылі, прапаноўвала аператарам закупіць, як гэта робіцца ў некаторых еўрапейскіх краінах, спецыяльнае абсталяванне, якое дазваляе аўтаматычна ідэнтыфікаваць у сетцы нелегальныя тэлефоны і аўтаматычна іх блакіраваць. Але пакуль што, у сувязі з уступленнем нашай краіны ў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам, разгляд гэтага пытання крыху прыпынены. Справа ў тым, што паступіла прапанова разгледзець пытанне аб урэгуляванні абароту тэлефонаў на тэрыторыі краін-саюзніц і па-за іх межамі на камісіі Мытнага саюза. Пачакаем, якое рашэнне прымуць там.

***— А можна сказаць, колькі нелегальных тэлефонаў сёння выкарыстоўваецца абанентамі беларускіх аператараў сотавай сувязі?***

— Калі 2-3 гады таму доля «шэрых» тэлефонаў, якія набывала наша насельніцтва, складала 85-90 %, то зараз яна складае не больш за 40 %. «Абяляцца» рынак мабільных тэлефонаў пачаў пасля таго, як Генпракуратура прапанавала аператарам сотавай сувязі павялічыць легальны ўвоз мабільных тэлефонаў і прадаваць іх з прымяненнем розных схем, у тым ліку з адтэрміноўкай плацяжу. Толькі ў 2010-м, у параўнанні з 2009 годам, паводле інфармацыі Дзяржаўнага мытнага камітэта, у рэспубліку ўвезена ў 2,2 раза больш афіцыйна зарэгістраваных тэлефонаў. А калі параўнаць з 2006 годам, то колькасць легальна ўвезеных тэлефонаў павялічылася ажно ў 4 разы. Гэта вельмі сур'ёзна ўдарыла па рынку «шэрых» тэлефонаў. Больш за тое, каб стварыць для законапаслухмяных пастаўшчыкоў тэлефонаў найбольш камфортныя ўмовы, мы прапанавалі шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на лібералізацыю абароту гэтых тэлефонаў. Сярод іх — укараненне сучасных прынцыпаў мытнага адміністравання. Сёння амаль 90 % экспарту сотавых тэлефонаў ажыццяўляецца шляхам электроннага дэкларавання. Гэта скарачае час іх паступлення ў абарот. Таму цяпер легальныя пастаўшчыкі фактычна знаходзяцца ў роўных умовах па часе з тымі, хто увозіць мабільнікі нелегальна.

**Не так даўно ў Генпракуратуру прыйшла скарга ад грамадзяніна, які вось ужо паўгода не можа знайсці махляра, у якога праз інтэрнэт набыў свой тэлефон за 700 долараў. Я не скажу, што такіх скаргаў паступае шмат, але тым не менш яны ёсць.**

***— Але большасць «шэрых» тэлефонаў нічым не адрозніваецца ад «белых», акрамя таго, што «шэрыя» былі ўвезены без выплаты пошлін і падаткаў...***

— Я не кажу аб усіх «шэрых» тэлефонах. Але, мяркуйце самі, калі чалавек набыў тэлефон у афіцыйнага пастаўшчыка, то ў выпадку няспраўнасці можна прыйсці і прад'явіць свае прэтэнзіі. Усё празрыста. «Шэрыя» сотавыя тэлефоны да нас паступалі, у асноўным, з Расіі і Украіны. Туды ж яны трапляюць, як правіла, у выглядзе запчастак. Таму зразумела, што львіная доля «шэрых» тэлефонаў выраблена не ў заводскіх умовах. А дзе гарантыя таго, што гэты тэлефон будзе служыць доўга і якасна?.. У прыватнасці, не так даўно ў Генпракуратуру прыйшла скарга ад грамадзяніна, які вось ужо паўгода не можа знайсці махляра, у якога праз інтэрнэт набыў свой тэлефон за 700 долараў. Я не скажу, што такіх скаргаў паступае шмат, але тым не менш яны ёсць.

***— Можаце зрабіць нейкі прагноз, калі, нарэшце, беларускі рынак будзе пазбаўлены ад «шэрых» мабільнікаў, частку якіх, як мы ўжо казалі, папаўняюць скрадзеныя і перапраграмаваныя тэлефоны?***

— Намаганнямі толькі праваахоўных органаў альбо аператараў сотавай сувязі праблемы не вырашыць. Тут патрэбны комплексны падыход. Многае залежыць і ад саміх грамадзян. У чарговы раз заклікаем людзей не набываць тэлефоны «з рук». Бо хто гарантуе, што ён не апынецца ў спісе тых, якія шукаюцца, прычым нават не па крадзяжы, а па нейкім больш сур'ёзным злачынстве. Навошта вам гэтыя непрыемнасці?..

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

### Сёння — Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў

## БЕЛАРУСЬ РАТУЕ СВЕТ

### Аднаўленне балот спыняе змяненне клімату

Вядома, што балоты на планеце — самыя важныя доўгатэрміновыя сховішчы вугляроду на Зямлі. На думку сусветных экспертаў, у Еўропе меліяраваныя балоты сталі цяпер галоўнай крыніцай выкідаў у паветра вуглякіслага газу. У 1960-70 гадах тысячы гектараў беларускіх балот былі асушаныя для выкарыстання ў лясной і сельскай гаспадарцы. Гэта павялічыла выкіды дыяксіду вугляроду і страты месцаў жыхарства для многіх відаў жывёл і раслін.

Прыкладна палова тарфянікаў нашай краіны (1,5 млн га з 3 млн га) была асушана для здабычы торфу і для выкарыстання ў сельскай гаспадарцы. Выкіды вуглякіслага газу з гэтых тарфянікаў складаюць каля 15 мільёнаў тон штогод. Для памяншэння выкідаў парніковых газаў, захавання біялагічнай разнастайнасці і стварэння лепшых эканамічных умоў для мясцовых жыхароў у Беларусі ў верасні 2008 года стартаваў праект па аднаўленні тарфянікаў. Узнаўляецца звыш 14 тысяч гектараў дэградаваных тарфяных балот. У Беларусі агульная плошча парушаных балот складае каля 520 тысяч гектараў, што ў два разы больш за плошчу Люксембурга.

**Даведка «Звязды»:**

Калі падлічыць, колькі вугляроду знаходзіцца ва ўсіх балотах свету, то атрымаецца вельмі вялікая лічба — каля 550 гігатон. Гэта 75 працэнтаў усяго вугляроду, які ёсць у атмасферы, што ў два разы больш, чым ва ўсіх лясах планеты. Выкід усяго гэтага сусветнага вугляроду з балот у паветра павялічыў бы канцэнтрацыю двувокісу вугляроду ў атмасферы амаль у два разы. Гэта можа выклікаць кліматычную катастрофу. Ужо зараз навукоўцы ўпэўнены, што асушаныя балоты адказваюць за 10 працэнтаў усіх выкідаў двувокісу вугляроду ў атмасферу. Пасля аднаўлення балот Беларусі тарфянікі перастаюць выкідваць у паветра вуглякіслы газ, а робяцца сапраўды лёгкімі Еўропы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СПІЛАВАНАЕ ДРЭВА ЎПАЛА НА ЧАЛАВЕКА

Жыхар вёскі Кісялёўцы Брэсцкага раёна, рабочы мясцовага СВК, пілаваў лес. Адно дрэва ўпала і зачапіла 59-гадовага аднавяскоўца вальшчыка лесу. Ад атрыманых траўмаў чалавек памёр у бальніцы. Па падазрэнні ў парушэнні правілаў тэхнікі бяспекі ў дачыненні да трактарыста пракуратура завяла крымінальную справу.

**Яна СВЕТАВА.**

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 04 марта 2011 года в 14.00 со следующей повесткой дня:**

1. О результатах работы Общества за 2010 год и основных направлениях деятельности Общества в 2011 году.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2010 году.
3. Утверждение заключения Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год. Рассмотрение результатов аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счета «прибыли и убытки» Общества за 2010 год.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) за 2010 год и выплате дивидендов.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2011 году.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Место проведения — Торговый центр «Рига»: г. Минск, ул. Сурганова, 50.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность.

Регистрация участников собрания с 12.30 до 13.00.

УНП 100299678 **Наблюдательный совет.**

Открытое акционерное общество

**«СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4»**

сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров. Собрание состоится 15 февраля 2011 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, актовый зал.

**Повестка дня:**

**1.** О реорганизации ОАО «Стройтрест № 4» путем присоединения ОАО «120 УНЭР».

**2.** О приобретении ОАО «Стройтрест № 4» акций собственного выпуска № 1.

**3.** Утверждение цены выкупа акций ОАО «Стройтрест № 4» выпуск № 1.

**4.** Утверждение величины чистых активов ОАО «Стройтрест № 4» по состоянию на 01.01.2011 г.

**5.** Утверждение договора о присоединении ОАО «120 УНЭР» к ОАО «Стройтрест № 4».

Регистрация участников собрания проводится с 14.00 до 14.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров — по доверенности.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра на 1 февраля 2011 года.

С материалами собрания можно ознакомиться с 8 февраля 2011 г. с 9.00 до 17.00 в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 203.

Справки по тел. в г. Минске: 334 11 65, 334 14 67.

**Наблюдательный совет.** *УНП 100055368*

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту Аддзела па рабоце з дакументамі Русак Таццяне Вілораўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

### Моўнае пытанне

# Як «Наша слова» адгукнецца...

**ВЫЙШАЎ тысячны нумар газеты «Наша слова» — гэта, магчыма і не свята для ўсіх. Яшчэ не свята, пакуль не ўсе нашы грамадзяне чытаюць газеты па-беларуску. Затое сам выхад гэтай газеты — адна з перамог «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». Газета выдаецца з сакавіка 1990-га года і з'яўляецца органам гэтай грамадскай арганізацыі.**

Орган — гэта нешта жывое, тое, без чаго не можа існаваць чалавек. У прынцыпе, так і ёсць: гэта адзін з тых органаў, які адказвае за тое, каб было чуваць голас беларуса. Нездарма газета адыграла вялікую ролю ў справе прыняцця Вярхоўным Саветам БССР Закона аб мовах, дзякуючы якому беларуская мова была абвешчана дзяржаўнай. Яна і дагэтуль — голас тых беларусаў, якія вылучаюцца сваёй адданасцю і павагай да роднай культуры. Найбольш за ўсё такіх у шэрагах Таварыства беларускай мовы. Ці паспрыяў выхад газеты на прыток сяброў у арганізацыю? З такім пытаннем мы звярнуліся да **старшыні арганізацыі Алега ТРУСАВА.**

— Вядома, каб не было «Нашага слова», то не было б і нашай арганізацыі. Гэта касцяк, таму што кожны падпісчык ведае ўсе навіны, ён піша сам, кантактуе з іншымі праз газету таксама. Усе мы ведаем сілу друкаванага слова.

***— Адметна, што газета «Наша слова» існуе на грамадскім фінансаванні. У нас такое актыўнае грамадства?..***

— Так, з 97-га года нам адмовілі ў дзяржаўным фінансаванні, і мы цалкам на грамадскім. Было рознае. Я калісьці, як у былыя часы, даваў слова, што пагашу доўг, і друкары друкавалі газету за свой кошт, а потым я знаходзіў грошы і вяртаў. І такія былі выпадкі ў нашым жыцці... Але галоўнае — мы здолелі захаваць выданне.

І яшчэ ў нас два часопісы. Часопіс «Верасень», напрыклад, можна сказаць на адным энтузіязме стварылі. А яшчэ ў Лідскім раёне выходзіць краязнаўчы часопіс. Толькі мы стварылі такі — адзін на ўсю Беларусь. Калі б было жаданне, то шмат якія ідэі можна было б ажыццявіць.

***— А колькі сёння ў ТБМ сяброў?***

— Ніхто іх дакладна не лічыў. Але самых актыўных 5,5 тысячы. Ніводная грамадская арганізацыя ці рух столькі не мае. А калі сабраць усіх нашых прыхільнікаў, то можа і 15—20 тысяч будзе. Але на маю думку, калі ёсць велізарная арганізацыя, то на першы план выходзіць якасць яе працы. Гэтым і вымяраецца ўплыў яе на грамадскія працэсы.

***— ТБМ — адна з самых актыўных грамадскіх арганізацый Беларусі, якая пастаянна падымае пытанні рэальнай роўнасці дзвюх дзяржаўных моў краіны. Дзеля гэтага не першы год вы прасоўвалі ідэю абвясціць Год беларускай культуры і мовы. Нядаўна на радзе ТБМ абмяркоўвалася чарговая прапанова наконт прыняцця паправак у Закон аб мовах, каб беларускай мовай можна было карыстацца ва ўсіх сферах жыцця. Што будзеце рабіць, каб вас пачулі?***

— На радзе ТБМ вялася гаворка аб неабходнасці прыняцця закона ці пастановы ўрада аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы. У кастрычніку нас чакае з'езд Таварыства беларускай мовы. Мы хочам да з'езда распрацаваць праект закона аб падтрымцы роднай мовы. Дзеля гэтага мы стварылі групу, якая будзе працаваць над гэтым. У нас ёсць пэўныя напрацоўкі. Але да з'езда яшчэ шмат трэба зрабіць. Мы хочам у Савет Міністраў унесці свае прапановы.

***— Да таго, як адбудзецца з'езд ТБМ, вы не збіраецеся свае напрацоўкі выносіць на грамадскае абмеркаванне? Бо гэта тычыцца ўсіх грамадзян краіны.***

— Вядома. Тым больш, што група, якую мы стварылі, павінна асэнсаваць усё, што ў нас ёсць ці будзе. У нас ёсць час, каб сёе-тое дапрацаваць, а потым прапановы надрукуем у «Нашым слове», будзем абмяркоўваць да з'езда. Прапановы будуць аформлены ў форме закона аб падтрымцы дзяржавай беларускай мовы.

***— Ці ёсць спадзяванне, што гэта будзе мець канкрэтны вынік? Бо сама дзяржава павінна беларускую мову абараняць у прынцыпе і без дадатковых захадаў.***

— Каб быў рэальны вынік гэтай абароны, то мы б гэтым не займаліся. А калі нешта робіш мэтанакіравана і зацікаўлена, вынік ёсць заўжды.

***— Што значыць «падтрымка мовы»? Вы маеце на ўвазе стварэнне асобнага дзяржаўнага органа, з асобным фінансаваннем?***

— У ідэале. Мы вывучалі сусветны вопыт — фінскі, ірландскі... У Ірландыі, напрыклад, такі орган ёсць. Там ёсць дзяржаўны дэпартамент па абароне і падтрымцы дзяржаўнай мовы. Ёсць камісар па справах мовы і гэтак далей. У многіх краінах гэта ёсць. У Ірландыі я, як старшыня ТБМ, быў разам з нашымі чыноўнікамі, прадстаўнікамі розных міністэрстваў і ведамстваў...

***— Як чыноўнікі рэагавалі на тое, пра што даведаліся?***

— Тым, што ездзілі, было цікава. Але чыноўнік ёсць чыноўнік: ён з ініцыятывай рэдка выступае. А вось раптам начальству не спадабаецца — і што?.. Дарэчы, у Ірландыі, пакуль чыноўнікі займаліся мовай, то яна амаль загінула. А як народ выйшаў на вуліцы Дубліна, тады мова пачала хоць пакрысе, але трошкі адраджацца. Там таксама ёсць грамадская арганізацыя, як ТБМ. Самае цікавае, што кіраўнік яе двойчы быў у Беларусі, прыязджаў, на роварах ездзіў...

***— Напэўна, яшчэ і нашу моўную сітуацыю неяк ацаніў?***

— У нас яна намнога лепшая, чым у Ірландыі. Непараўнальна лепшая.

***— Сёння. А калі ўлічыць перспектыву?..***

— Вось каб не было такой перспектывы, як у Ірландыі, трэба працаваць, патрэбны і закон. Калі нічога не рабіць ужо сёння, то атрымаем тое, што адбылося там. А можа і яшчэ горш.

***— У нас афіцыйнае двухмоўе, і паводле рашэнняў, дзяржава павінна гарантаваць роўныя магчымасці да развіцця абедзвюх моў...***

— Але ці так гэта рэальна? Заўвагі «ці» і «або» наконт выкарыстання моў ніякай гарантыі не нясуць. Па-другое, няма праграмы дзяржаўнай падтрымкі, дзе былі б пазначаны канкрэтныя крокі і захады. Тое, што было ў пачатку 90-х, скасавана. Мы даплачвалі пэўныя заахвочвальныя сумы настаўнікам, выкладчыкам універсітэта і гэтак далей. «Наша слова», дарэчы, выходзіла за дзяржаўныя грошы. Такая грамадская арганізацыя, як ТБМ, плаціла сімвалічную арэнду за памяшканне. Цяпер мы плацім 5 мільёнаў у месяц, гэтыя грошы трэба знайсці — яны ж немалыя. Нас прыраўнялі да камерцыйнай арганізацыі. Але мы знаходзім сродкі, просім у людзей, збіраем ахвяраванні. І тое, што арганізацыя існуе, — сапраўды заслуга нашага грамадства. Але ж каб гэтыя грошы ішлі на Беларушчыну, колькі кніжак мы б выдалі на іх!.. А так, атрымліваецца, што мы падтрымліваем дзяржаву, а не наадварот. Таму спадзяёмся, што дзяржава падтрымае нас, пачуўшы голас грамадства.

**P.S.** ***Газета «Звязда» далучаецца да віншавання калег з газеты «Наша слова». І будзе працягваць друкаваць матэрыялы па моўнай тэматыцы, таксама спадзеючыся, што калі-небудзь мы пражывём разам Год беларускай мовы. А дасць Бог — і не адзін!..***

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### Карніленка накіраваўся ў Англію

Нападаючы нацыянальнай зборнай па футболе і санкт-пецярбургскага «Зеніта» Сяргей Карніленка стаў другім беларусам, які будзе гуляць у мацнейшым футбольным першынстве свету — англійскай прэм'ер-лізе. Чэмпіён Расіі зноў аддаў беларускага футбаліста ў арэнду, на гэты раз англійскаму клубу «Блэкпул» да канца сезона. Каманда з аднайменнага англійскага горада ў сезоне 2010—2011 выйшла ў Прэм'ер-лігу з другога дэвізіёна і цяпер пасля 23 матчаў займае 12 месца сярод 20 каманд.



### У беларусаў «золата» ў юніёрскім біятлоне

На юніёрскім чэмпіянаце свету па біятлоне ў Нове Места (Чэхія) у каманды Беларусі з'явілася першае золата — індывідуальную гонку на 12,5 кіламетра з чатырма агнявымі рубяжамі выйграў Павел Ганчароў, які прайшоў дыстанцыю за 35 хв. 54,3 сек., не дапусціўшы ніводнага промаху.

### Каманда Штанге згуляе з канадцамі

Зборная Беларусі па футболе плануе 29 сакавіка згуляць таварыскі матч з камандай Канады ў турэцкай Анталіі. А адкрые новы сезон нацыянальная каманда 9 лютага сустрэчай са зборнай Казахстана, якая таксама адбудзецца ў Турцыі.

# «СТРОГІ, СПРАВЯДЛІВЫ І ДОБРЫ НАСТАЎНІК ЗАЎСЁДЫ БЫЎ У ПАШАНЕ Ў ВУЧНЯЎ...»

**ПРАЙШЛО дастаткова часу пасля публікацыі ў «Звяздзе» артыкулаў, у якіх аналізаваліся веды сёлетніх абітурыентаў. А я ўсё знаходжуся пад іх уражаннем. Спадзяюся, уся грамадскасць удзячная «Звяздзе» за пастаноўку актуальных праблем, сугучных чаканням настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў, за праўдзівыя, незвычайна смелыя артыкулы і водгукі на іх. Спадзяюся, што і мой голас будзе пачуты ...**

42 гады я выкладаў у сваёй роднай Баркалабаўскай сярэдняй школе фізіку і матэматыку, 25 гадоў працаваў завучам. І мне крыўдна да слёз, што па выніках цэнтралізаванага тэсціравання мая любімая фізіка аказалася на апошнім месцы. Асабліва цяжка мне зразумець, чаму палова абітурыентаў на тэстах па фізіцы не ведалі, у якіх адзінках вымяраецца напружанне?

Хачу крыху суцешыць цяперашніх настаўнікаў, бо ў сучаснай школе ўмовы для працы настаўнікаў — намнога лепшыя. У 50-я гады школа працавала ў дзве змены, а кіравалі ёй тры чалавекі: дырэктар, завуч і старшая піянерважатая. Гэта потым з'явіўся арганізатар пазакласнай работы. Дзяцей не дзялілі па здольнасцях. Настаўнік павінен быў падцягваць тых, хто адставаў, і працаваць з лепшымі вучнямі. Кожны месяц па вечарах у трох населеных пунктах (за 3—6 кіламетраў) ладзіліся бацькоўскія сходы з аналізам ацэнак і паводзін кожнага вучня. Настаўнікі самі клапаціліся пра забеспячэнне свайго прадмета нагляднымі дапаможнікамі і абсталяваннем, для чаго кожны год абавязкова наведвалі магазін наглядных дапаможнікаў у вобласці. Усю справаздачнасць вёў завуч школы.

Ад школы строга патрабавалі арыентаваць вучняў на работу ў сельскай гаспадарцы, але яны цягнуліся да навукі. У жніўні гэтага года планавалі сустрэцца ў роднай школе выпускнікі 1965 года (з-за спякоты сустрэча сарвалася). З іх класа ўсе да аднаго паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Нават выпускнік з «тройкамі» ў атэстаце паказаў добрыя веды пры паступленні ў ваеннае вучылішча. Пра заробак мы не думалі, бо ў тыя часы ўсе атрымлівалі няшмат.

У сучасных школах ёсць і інтэрактыўныя дошкі, і камп'ютары, і інтэрнэт, і падручнікі ў электронным варыянце, і шмат чаго іншага. Асаблівая ўвага надаецца адораным і здольным дзецям, а самыя таленавітыя з іх атрымліваюць матэрыяльную дапамогу ад Прэзідэнта. У штаце школ з'явіліся сацыяльны педагог і псіхолаг, была ўведзена дадатковая аплата за розныя віды работ. Аднак відавочныя і многія прабелы ў працы школ. Так, у гарадскіх школах бацькам даводзіцца думка, што ў школе іх дзецям даецца толькі агульная адукацыя, а таму, калі тыя плануюць паступаць у ВНУ, трэба наймаць дадаткова рэпетытараў. Не адмаўляючы цалкам станоўчую ролю рэпетытарства, хацеў бы канстатаваць, што аднаго толькі муштравання па прадмеце выпускнікам недастаткова, але большасць сярэдніх па сваіх здольнасцях вучняў лічаць, што гэтых ведаў ім будзе дастаткова для здачы тэстаў і далейшага навучання. Таму яны не хочуць прыкладаць уласных намаганняў да здабывання ведаў, а ўвесь дзень корпаюцца ў камп'ютары. Шкада, што сёння мала хто хвалюе выхаванне рознабакова адукаванай і развітой асобы. Выклікае спачуванне той, хто так абядніў сваё жыццё тым, што не чытаў твораў Купалы, Коласа, Пушкіна, Гогаля, Талстога, Шолахава, Жуль Верна, Дзюма і многіх іншых. Камп'ютар не можа замяніць чытанне кніг, як нават і кніга ў электронным варыянце...

Не зразумела, хто і навошта загрузіў настаўнікаў непатрэбнай пісанінай, адабраўшы ў іх час для творчай работы з вучнямі? Чаму ў многіх шолах знікла абсталяванне для правядзення лабараторных і практычных работ па фізіцы? Вучань, які патрымаў у руках з дзясятак разоў вальтметр, ніколі б не забыўся, у чым вымяраецца напружанне. Лічу, што настаўніку трэба даць магчымасць самому клапаціцца пра абсталяванне для свайго кабінета, а не рабіць закупкі цэнтралізавана. Мне крыўдна, што ў некаторых школах пануюць паказуха, зніжэнне патрабавальнасці да вучняў і пагалоўнае спісванне. Строгі, справядлівы і добры настаўнік заўсёды быў у пашане у вучняў!

Відавочна, што ў школах, выхаванцы якіх атрымліваюць на тэсціраванні нізкія балы, мала надаюць увагі ці ўвогуле забываюць пра галоўны абавязак настаўніка — запаліць агонь прагі да спасціжэння навук, развіць у дзецях дапытлівасць. Безумоўна, для гэтага патрэбна гарэць самому. Прывяду толькі некаторыя прыклады, як гэта рабіў я. Прымусіць вучня палюбіць прадмет немагчыма, можна толькі паспрабаваць ім зацікавіць. Канчатковыя формулы і высновы ажываюць для вучня, калі настаўнік пастаянна знаёміць яго з «чалавечым» бокам навукі: з гісторыямі адкрыццяў і біяграфіямі вучоных, іх самаахвярнай барацьбой, пераадоленнем непаразумення. Для сучасных школьнікаў я, напрыклад, раскрыў бы значэнне адкрыцця лаўрэата Нобелеўскай прэміі Жарэса Алфёрава для сучаснай электронікі. Па матэматыцы для дзяцей быў бы цікавым аповед пра гісторыю адкрыцця яшчэ аднаго Нобелеўскага лаўрэата — матэматыка Перальмана.

Кожны школьнік павінен быць перакананы, што прадмет, які ён вывучае, будзе запатрабаваны ім у жыцці. Між іншым, веды па фізіцы могуць спатрэбіцца чалавеку літаральна на кожным кроку. Важнае месца для выхавання інтарэсу да фізікі мае ўдзел вучняў у рабоце фізіка-тэхнічнага гуртка, асабліва заняткі справамі, якія апярэджваюць свой час ці ідуць з ім у нагу. Калі ў сярэдзіне 50-х гадоў мінулага стагоддзя ў вёсцы пачалі з'яўляцца першыя радыёпрыёмнікі, многія гуртkоўцы захапляліся вырабам дэтэктарных радыёпрыёмнікаў. Я прапанаваў стварыць школьны радыёвузел. Падабралі радыёсхему, набылі патрэбныя дэталі, магутны мікрафон падараваў раённы радыёвузел, гучнагаварыцелі набылі ў крамах. Юныя фізікі шчыравалі ўвесь год. Акустыка была выдатнай. Радаваліся мае гуртkоўцы, радавалася ўся школа. Музыка ўпрыгожыла школьнае жыццё, яна здымала напружанне і стварала бадзёры настрой. Радыёперадачы ўзбагацілі выхаваўчы працэс у школе. Распавядаю пра далёкае мінулае таму, што мяне ўразіла нядаўняя гутарка па тэлефоне з маім вучнем, які прыгадаў, як наладжвалася работа школьнага радыёвузла. Аказалася, што любімая і карысная справа засталася ў яго ў памяці на ўсё жыццё...

Праз два гады для заняткаў фізіка-тэхнічнага гуртка была выкарыстана спісаная ў калгасе аўтамашына, якую мы вырашылі адрамантаваць. Працавалі з творчым азартам, і, калі, нарэшце, машына была адноўлена, радасці не было межаў, бо цяпер старшакласнікі маглі паехаць на экскурсію ці на спаборніцтвы ў горад, вывучаць тэхніку, знаёміцца з прафесіяй кіроўцы.

У 60-70-я гады прадметныя кабінеты хутка папаўняліся як набытымі, так і саматробнымі нагляднымі дапаможнікамі, тэхнічнымі сродкамі навучання. У школах загаварылі аб першых навінках праграмаванага навучання. Члены фізіка-тэхнічнага гуртка вырабілі камплект перфакарт і стварылі машыну для праверкі ведаў вучняў. Падобныя прыклады можна прыводзіць і далей. Эфектыўнасць падобнай работы пацвярджае само жыццё. Восенню мінулага года наша школа святкавала свой 125-гадовы юбілей. Сустрэча выпускнікоў яскрава прадэманстравала, чаго дасягнула школа за другую палову ХХ стагоддзя. Скажу толькі, што гэта быў трыумф фізікі! Першымі выступалі навуковы супрацоўнік НДІ электронных машын і генерал-маёр авіяцыі (яны аднаго выпуску). Дык вось, мае выпускнікі прыгадвалі работу фізіка-тэхнічнага гуртка. Да самага позняга вечара ў нас знайшліся тэмы для ўспамінаў. Таксама шмат радасных хвілін перажыла настаўніца матэматыкі (яна ж былы дырэктар школы) і іншыя ветэраны школы.

Вельмі радуюць мяне поспехі сучаснага калектыву Баркалабаўскай школы: яе дырэктар і завуч вывелі школу на лідзіруючыя пазіцыі ў раёне, наладзілі ўзорнае функцыянаванне педагагічнага працэсу. Настаўнікі школы — майстры педагагічнай справы, яны працуюць творча і якасна, паспяхова ўдзельнічаюць і перамагаюць у многіх конкурсах педагагічнага майстэрства. Іх вучні з'яўляюцца пераможцамі прадметных алімпіяд і шматлікіх конкурсаў. Характэрна, што прадстаўніца школы на жнівеньскай педагагічнай нарадзе распавядала калегам, як ёй удаецца прывіць павагу дзецям да свайго прадмета. Відавочна, менавіта гэта галоўнае ў рабоце настаўніка — зацікавіць дзіця! Я ўдзячны свайму лёсу за тое, што мне давялося працаваць у школе. Мне дораць радасць сустрэчы з маімі вучнямі. І я лічу сябе шчаслівым чалавекам!

**КУЛЯШОЎ В.Ф.,**
**ветэран педагагічнай працы,**
*Быхаўскі раён, в. Залахвенне.*

# Ізалятар за дротам: бывае і горш?

## Карэспандэнт «Звязды» пабываў у віцебскім ізалятары часовага ўтрымання




**У ізалятары знаходзяцца за дротам тыя, хто, напрыклад, учыніў дробнае хуліганства ці падазраецца ва ўчыненні злачынства.**

Так званы «аўтазак» — турма на колах для перавозкі арыштантаў, камера на дзесяць чалавек з ложкамі, дзе замест матрацаў — дошкі. І тут жа ў камеры ўнітаз — адзін на ўсіх. Побач з унітазам — умывальнік. Прагулка? Калі ласка, на свежым паветры сярод чатырох сцен.

Здзівіла і тое, што, аказваецца, за харчаванне тут трэба плаціць. Канешне, калі пасля ізалятара выходзіш на волю: за суткі сем тысяч рублёў — прачытаў паведамленне.

Нагодай для часовага знаходжання карэспандэнта ва ўстанове за дротам стаў эксперымент. Упершыню ў краіне праблемных падлеткаў з усіх раёнаў Прыдзвінскага краю, якім, як кажуць, толькі крок да дроту, прывялі сюды на экскурсію. Асабліва, дарэчы, з імі не цырымоніліся: «Стаяць, выходзім, заходзім, налева!» — чулі каманды хлопцы і некалькі дзяўчат.



— У ізалятары часовага ўтрымання пры Упраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама ўпершыню праводзіцца акцыя «Выбар». Мэта акцыі: паўплываць на непаўналетніх, якія знаходзяцца на ўліку ў крымінальна-выканаўчых інспекцыях, і па справах непаўналетніх Віцебскай вобласці. Усяго ў вобласці на ўліку больш за 1,5 тысячы падлеткаў. Ёсць сярод іх і дзяўчаты. У акцыі бяруць удзел каля сарака юнакоў і дзяўчат. Некаторыя з гэтых падлеткаў ужо былі асуджаны за крадзяжы, разбой, угон аўто. Але з улікам іх узросту судом прыменены меры пакарання, не звязаныя з ізаляцыяй ад грамадства. Гэта грамадскія ці папраўчыя работы, абмежаванне свабоды... Тут яны могуць убачыць тое, што ім «свеціць», калі зноў учыняць злачынства, — расказвае **Руслан СВІДЗІНСКІ, намеснік начальніка аддзела наглядна-выканаўчай дзейнасці Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.** — Лічым, што пасля ўбачанага падлеткі зробяць правільны выбар і не будуць далей парушаць закон.

16—17-гадовыя падлеткі падчас экскурсіі па ізалятары рэагавалі на ўбачанае па-рознаму. Многія нават смяяліся, быццам, у Дыснэйлэнд прыйшлі, а не за дрот. Адзін юнак прызнаўся карэспандэнту, што, маўляў, бываюць і горшыя месцы. Гэта дзе ж ён яшчэ быў? Падчас размовы дзяўчына і два яе равеснікі сціпла прызналіся, што сюды больш не хочуць.




Яшчэ больш паўплываў на іх адзін з сядзельцаў, які даў згоду на сустрэчу з юнымі і праблемнымі. Мужчына сказаў, што па адукацыі ён настаўнік фізкультуры, інструктар і масажыст. За што трапіў за дрот, прамаўчаў. Толькі сказаў, што яшчэ прыйдзецца тут пасядзець больш за тыдзень. Параіў не трапляць сюды.

У шэсць гадзін трэба падняцца, потым 45 хвілін, каб убраць пасцель, ранішні туалет, потым пакормяць... Ранішняя праверка і гэтак далей. Па такім распарадку жывуць у ізалятары. Дома горш?

Перад развітаннем юным гасцям ізалятара прапанавалі папіць чаю з салодкімі гасцінцамі. Міліцыянеры ім шчыра пажадалі не трапляць сюды. Ніколі. І няхай адзін, два з экскурсантаў насамрэч выберуць волю, а не ізалятар, — ужо тады мэта арганізатараў экскурсіі будзе дасягнутая.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Нефармат

# РАСПОВЕДЫ РУХУ

У розны час моладзь захаплялася танцамі. Некалі быў модны твіст, а яшчэ раней — вальс і танга.

Сярод маладых людзей новага пакалення вядомыя так званыя «вулічныя» танцы. Хіп-хоп, ціктонік, хаус, дыска — стыль жыцця многіх хлопцаў і дзяўчат. Яны слухаюць электра, рок, рэп і іншыя прагрэсіўныя музычныя напрамкі . А таксама танцуюць брэйк-данс, носяць шырокія штаны, малююць графіці — увогуле, жывуць толькі гэтым.

Што так прываблівае іх у гэтым відзе мастацтва? Спосаб самавыяўлення ці, можа, нешта іншае?

Каб атрымаць адказ на гэтыя пытанні, я звярнулася да кіраўніка і адначасова дырэктара студыі сучаснага эстраднага танца «ВіЗаВі» Віталіі Новаш. Шмат гадоў студыя дзейнічае ў Маладзечанскім Палацы культуры і аб'ядноўвае тых, для каго танец — гэта спосаб быць свабодным і гарманічным у выказванні сваіх думак і пачуццяў праз рух. «Візаві» (з франц. вочы ў вочы) — гэта непасрэдныя і вельмі шчырыя зносіны з гледачом.

А цяпер уявіце танец, які больш нагадвае тэатральную пастаноўку з захапляльным сюжэтам, дзе шмат пераапрананняў, дзе неардынарныя вобразы (ну, напрыклад... ведзьмы і вурдалакі), дзе пануюць эмоцыі. А мо ў танцы задзейнічаны прадметы — фітболы, свечы. Карацей — гэта не проста механічнае паўтарэнне нейкіх завучаных «па», гэта палёт фантазіі, гэта расповед, гэта размова, гэта раскрыццё пачуццяў і думак праз рух. Менавіта такое ўражанне ў мяне склалася, калі я ўбачыла выступленне студыі.

Сёння ў студыі «Візаві» каля 115 удзельнікаў ва ўзросце ад 3,7 да 21 года. Калектыў удзельнічае не толькі ў шматлікіх канцэртных праграмах і праектах Палаца культуры г. Маладзечна, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах, але і паказвае сябе за межамі краіны. Напрыклад, студыя «Візаві» прымала ўдзел у дабрачынных канцэртах у Польшчы і Бельгіі, у фестывалі «Радасць Еўропы» ў Сербіі.

— Чаму вырашылі адкрыць студыю менавіта эстрадных танцаў? — цікаўлюся ў Віталіі Новаш.

— Шчыра кажучы, калі стваралася студыя, была толькі адна мэта — адцягнуць дзяцей ад вуліцы, навучыць шанаваць творчасць (сваё і чужое), паспрабаваць акунуць у мір прыгожай казкі і фантазій. А на той момант эстрада карысталася ў дзяцей папулярнасцю. Да таго ж, мне заўсёды падабаліся працы расійскага шоу-балета Алы Духавай «Тодэс», Панфілава, замежных харэографаў. У іх ёсць нешта, што немагчыма перадаць словамі.

Развіваць дзіця — наша задача. Менавіта таму ўжо некалькі гадоў з дзецьмі працуюць некалькі выкладчыкаў: харэографы-пастаноўшчыкі (сучасныя кірункі харэаграфіі, праекты, стылізацыя, народны танец, класіка, эстрада) і педагог па акцёрскім майстэрстве. Дзеці атрымліваюць столькі інфармацыі, колькі хочуць панесці з сабой з заняткаў, усмоктваюць, як губка, усё тое, што даецца. І ў гэтым яны вялікія малайцы!

Найперш мы вучым сябраваць. Мець зносіны, рабіцца больш абачлівымі і цярплівымі да асяроддзя. Нездарма наш дэвіз: «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго!».

Ну, а калі з пункту гледжання харэаграфіі, то ў нас няма вузкай спецыялізацыі. Некаторыя студыі і калектывы бяруць 1-2 кірункі і працуюць толькі ў іх. Я лічу, што гэта не зусім правільна. У першую чаргу трэба развіваць дзіця. Менавіта таму мы бяром у працу ўсё, што можам. У нас атрымліваецца нейкі мікс са стыляў і кірункаў. Гэта і класіка, і сучасныя стылі, і народны танец, і стылізацыя, і трохі лаціны і мадэрну... Увогуле, эстрада — гэта і ёсць сумесь стыляў і кірункаў.

Мы не гонімся за модай. Ёсць рэчы, якія я даю дзецям, зыходзячы з таго, што яны хочуць (наш спектакль «НАША казка»). Але ў асноўным мы працуем з нумарамі, якія будуць запатрабаваныя на канцэртных пляцоўках... І вось тут мы сутыкаемся з цяжкасцямі. На жаль, наша краіна не ўспрымае сучасную харэаграфію. Калі гэта не так зроблена, як прынята (у асноўным у савецкія часы), то значыць, гэта не падыходзіць або гэта дрэнна... Новае не вітаецца... Таму вельмі цяжка прабіваць дарогу калектыву. Нават у родным палацы на працягу першых 2-2,5 гадоў даводзілася адваёўваць, даказваць правa на выхад на сцэну нашага калектыву з тымі нумарамі, якія, так бы мовіць, «нефармат».

**Таццяна БАЖКО,**
**студэнтка Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва.**

# FAST-FOOD ІНФАРМУЕ...

**Гісторыя амерыканскага fast-food пачалася з пяці цэнтаў. 1912 год, Нью-Ёрк, кампанія Horn&Hardart, Таймс сквер і закусачная «Аўтамат». Апускаеш манетку — і атрымліваеш гарачую каву, малако ці піва на выбар. Адкрываеш спецыяльнае акенца — гарачыя бабы, кавалак пірага ці сэндвіч. Вельмі проста, вельмі хутка.**



Гэтая зручная сістэма не магла не палюбіцца ўсім, не прыжыцца і не распаўсюдзіцца па свеце. Прагныя да задавальненняў амерыканцы штогод марнуюць мільярды долараў на тое, каб есці смачна. Велічэзныя супермаркеты, укамплектаваныя морам бескарысных і нясмачных прадуктаў, ледзь не падштурхоўваюць на гэта. McDonald's на сняданак, абед і вячэру — гэта амерыканская праўда, запраўленая дваццаццю відамі соусаў.

Апынуўшыся ў краіне, дзе больш за 60% насельніцтва маюць сур'ёзныя праблемы з вагой і насілу месяцца ў свае папяровыя хаткі і незразумелыя аўто, хацелася прачнуцца ад начнога кашмару. Купляючы ў краме арганічныя бананы і яблыкі, — крычаць!

«Людзі не хочуць чакаць, пакуль вырасце штосьці натуральнае, не хочуць траціць на гэта больш. Ім усё роўна як. Галоўнае — хутка! Адпаведна, акцэнт робіцца не на якасць, а на колькасць», — сумна распавядае мой прыязны сусед Фрэнк, які ніколі не п'е апельсінавы сок: той перанасычаны канцэнтратамі.

Ледзь не кілаграмовыя пачкі Lay's, легендарнае арахісавае масла, замарожаныя біскіты і тарты, тысячы соусаў і розных дадаткаў ва ўсе магчымыя прадукты, маляўнічыя пакеты з мініяцюрнымі Snickers і Twix, самыя натуральныя вёдры з марозівам і — амаль незаўважны аддзел агародніны і садавіны. І так усюды. Тое, што карысна, — дорага, а калі дорага — нікому не трэба. Амерыка прывыкла зарабляць хутка.

Ды што там... Штогод яны марнуюць 4,1 мільярда долараў толькі на хот-догі, з'ядаючы іх каля 150 мільёнаў у Дзень незалежнасці (4 ліпеня) і каля 818 у секунду штодзень. Пры гэтым амерыканцы будуць распавядаць вам пра перавагі здаровага харчавання і актыўнага ладу жыцця.

Дарэчы, у рэстаранах таксама даволі складана адшукаць што-небудзь акрамя бургераў і бульбы фры ў іх розных варыяцыях. Нават у самым фешэнебельным раёне Арт Дэка на набярэжнай Ocean Drive ў Маямі вядомыя рэстараны і бары чаргуюцца з забягалаўкамі fast-food. І самае цікавае, што кошт на сэндвіч хуткага гатавання нічым не ніжэй, чым на любую страву з рыбы, мяса і гародніны. Вось дзе логіка, здавалася б... Жыць там, дзе ёсць усё, але браць толькі горшае.

Амерыканскае багацце змушае нудзіцца па родных і смачных беларускіх прадуктах. Па, здавалася б, банальным чорным хлебе, існаванне якога выклікае відавочныя сумненні ў ЗША. Іх хлеб характарызуецца здольнасцю сціскацца да памеру ў 1 см і ўмомант раздзімацца зноў, захоўвацца неверагодна доўга і станавіцца гумавым. 3,5 долара — і вы захочаце дахаты!

Яшчэ адзін парадокс — гэта рыба. Акружаная з усіх бакоў акіянамі Амерыка, напэўна, забылася пра гэта. У супермаркеце можна сустрэць максімум 5 відаў рыбы! Прычым не самай арыгінальнай, свежай і смачнай... Выклаўшы за яе значную суму, праз некалькі тыдняў жыцця на іншым кантыненце вы паверыце ў тое, што гэта — далікатэс!

Такая агідная якасць прадуктаў і іх нясмачнасць ніякім чынам не замінае амерыканскаму насельніцтву знішчаць сябе. Яны абагаўляюць усё, што можна з'есці. Яны арганізоўваюць і праводзяць разнастайныя фэсты ежы і актыўна ў іх удзельнічаюць. Адзін з такіх фэстаў штогод праходзіць у Маямі і збірае натоўпы замежных турыстаў з усяго свету. Віно разліваецца па куфлях для дэгустацыі, ежа раскладваецца па талерках, музыка гучыць, а эмоцыі не адпускаюць. Безумоўна, Маямі дзівіць. На шчасце, не толькі наяўнасцю бургераў у рэстаранах.

Cafe Cubano cafecito — эспрэса па-кубінску, якасная молатая кава, змяшаная з нерафініраваным цукрам, — адметны знак Маямі, які рэабілітаваў горад у маіх вачах.

Кубінцы прынеслі з сабой каханне да вытанчанай моцай кавы. Амерыканцы, якія ўшаноўваюць Starbucks, проста забыліся, што такое сапраўдны густ кавы. Попыт нараджае прапанову. Ці забівае традыцыю. Яны паглынаюць літрамі нейкія кактэйлі па вар'яцкіх рэцэптах — з сіропамі, смакавымі лікёрамі і лёдам, — а потым ганарліва падагульняюць, якую смачную і падбадзёрлівую каву яны выпілі.

І ў гэтым уся Амерыка. Такая іншая, такая белазубая і па-дзіцячы наіўная. Баіцца апельсінавага соку з канцэнтратамі, абмакваючы рыфленыя чыпсы ў маянэзны соус. Перасцерагае ад сябе і так перaканаўча ашукваецца...

**Дзіяна АРЫПАВА. Фота аўтара.**

# БРАКАНЬЕРЫЛІ МІЛІЦЫЯНЕР І ВЫРАТАВАЛЬНІК-ПАЖАРНЫ

Работнікі Лідскай міжрайінспекцыі выявілі, што ў паляўнічых угоддзях Воранаўскай раённай структуры «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў» быў незаконна здабыты дзік.

Падчас працы следча-аператыўнай групы Воранаўскага РАУС устаноўлены падазроныя — участковы інспектар гэтага ж райаддзела міліцыі і індывідуальны прадпрымальнік. У доме ў супрацоўніка міліцыі канфіскавана частка мяса дзіка вагой 10 кілаграмаў, галава і шкура жывёлы. Пра здарэнне паведамілі ў галоўнае ўпраўленне ўласнай бяспекі МУС. Матэрыялы накіраваны ў пракуратуру Воранаўскага раёна для дачы прававой ацэнкі і прыняцця рашэння.

А работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі ў паляўнічых угоддзях Чэрыкаўскага лясгаса затрымалі выратавальніка-пажарнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях г. Крычава. Ён разам зноў жа з індывідуальным прадпрымальнікам і беспрацоўным грамадзянінам паляваў без дазвольных дакументаў з выкарыстаннем незарэгістраванай паляўнічай зброі. Канфіскаваны тры незарэгістраваныя стрэльбы, боепрыпасы і паляўнічыя нажы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже права заключения договоров аренды помещений в зданиях, находящихся в республиканской собственности

Аукцион состоится **10 марта 2011 г.** в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона – фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8 (0222) 229022, 311185, 223375.

Продавцы права заключения договоров аренды помещений: по лотам №№ 1–3 – республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел.: 8 (0222) 253549, 8 (017) 2260173, 2261170; по лоту № 4 – транспортное республиканское унитарное предприятие «Могилевское отделение Белорусской железной дороги», тел. 8 (0222) 392182.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **7 марта 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **10 марта 2011 г.** с 10.00 до 10.50.

| № лота | Сведения о предметах аукциона | | | | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | | |
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена продажи права заключения договора аренды недвижимого имущества, руб. | Срок аренды недвижимого имущества, лет | |
| 1. | Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 12,7 кв.м | г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149 | 111 125 | 5 | 11,0 |
| 2. | Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 12,1 кв.м | г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149 | 105 875 | 5 | 10,0 |
| 3. | Помещение, размещенное на 2 этаже здания районного узла почтовой связи площадью 23,0 кв.м | г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 149 | 201 250 | 5 | 20,0 |
| Краткая характеристика помещений по лотам №№ 1–3: помещения телефонизированы, имеют электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение, канализацию, находятся в удалении от центра города. | | | | | |
| 4. | Здание специализированное иного назначения, двухэтажное, стены кирпичные, кровля рулонная общей площадью 379,5 кв.м, отопление – чугунные радиаторы (не подключены) | г. Могилев, ул. Кулибина, 35 | 3 320 625 | 5 | 300,0 |

Предполагаемое целевое использование имущества:

по лотам №№ 1–3 – для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств);

по лоту № 4 – складирование и хранение товарно-материальных ценностей, производство товаров, выполнение работ.

Договорной коэффициент к базовой ставке арендной платы за 1 кв.м в месяц по лотам №№ 1–4 – 2,0.

При наличии 2-х или более участников аукциона по лотам №№ 1–3 коэффициент от 0,5 до 3 включительно, устанавливаемый к базовой ставке арендной платы по соглашению между арендатором и арендодателем, увеличивается на 0,5.

Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона.

При подаче документов организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Датой поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Победитель аукциона приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

Срок заключения договора аренды – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.


# Пляцоўка для падрыхтоўкі прафесійных кадраў для ІТ-індустрыі

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрыўся Цэнтр ІТ-кампетэнцый БДУ-IBA.**

Цэнтр аснашчаны 22 сучаснымі камп' ютарамі з выхадам у інтэрнэт. У бліжэйшы час плануецца іх падключэнне да сервераў кампаніі IBA. У цэнтры будзе ажыццяўляцца навучанне студэнтаў і выкладчыкаў у рамках рэалізацыі ўніверсітэцкіх праграм IBA, у тым ліку праграмы «Акадэмічная ініцыятыва IBM», якая зараз ужо працуе ў БДУ; адукацыйнай праграмы Microsoft, якая ўключае такія напрамкі, як інавацыі ў вучэбным працэсе (IT Academy, Цэнтры інавацый, MLG, MDAA, E-Learning), праграмы ліцэнзавання для выкладчыкаў і студэнтаў (CASA, MSDN, Academic Alliance, Faculty Connection), падтрымку студэнтаў і маладых спецыялістаў у правядзенні алімпіяд і канферэнцый (Imagine Cup, «Тэхналогіі Microsoft у тэорыі і практыцы праграміравання»); праграм навучання на SAP-ландшафце, разгорнутым на серверах кампаніі IBA, а таксама навучанне выкладчыкаў і студэнтаў сучасным інфармацыйным тэхналогіям у адпаведнасці з патрэбамі групы кампаній IBA.

«Група IBA» з'яўляецца буйнейшым холдынгам па распрацоўцы, вытворчасці і пастаўцы інфармацыйных тэхналогій у краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. На сёння ў 8 краінах дзейнічае 20 прадстаўніцтваў гэтай кампаніі. У Беларусі IBA цесна супрацоўнічае з БДУ, БДУІР, Гомельскім і Гродзенскім дзяржаўнымі ўніверсітэтамі. Цэнтр ІТ-кампетэнцый БДУ-IBA быў створаны ў рамках пагаднення аб двухбаковым супрацоўніцтве паміж Белдзяржуніверсітэтам і кампаніямі «Групы IBA» («Міжнародным дзелавым альянсам» і «ІТ-паркам»).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


Чырвоная змена

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292 44 12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# СЁННЯ — ДЗЕНЬ СУРКА

**Ёсць нагода!**

**ДЗЕНЬ сурка (Groundhog Day) — традыцыйнае народнае свята ў Канадзе і ЗША, якое адзначаецца 2 лютага. Лічыцца, што ў гэты дзень трэба назіраць за сурком, які вылазіць са сваёй норкі, каб па яго паводзінах меркаваць аб хуткасці надыходу вясны.**

Традыцыі свята Дня сурка выходзяць з глыбокай старажытнасці, гэта сплаў вераванняў індзейцаў, звязаных з жывёламі, і прынесеных еўрапейскімі перасяленцамі прыкмет аб надвор'і. Сэнс свята ў тым, што, абудзіўшыся ад зімовай спячкі, сурок па надвор'і вызначае, ці варта яму яшчэ паспаць колькі тыдняў альбо ўжо час вылазіць з норкі і сустракаць вясну. Калі надвор'е сонечнае і сурок бачыць свой цень, то зіма будзе доўжыцца яшчэ 6 тыдняў — а значыць, канчаткова абуджацца сурку рана. Калі ж надвор'е пахмурнае і свайго ценю сурок не бачыць — значыць, вясна не за гарамі і можна пачаць рыхтавацца да сустрэчы з ёй.



Вясна прыйдзе, кошт нафты стабілізуецца, долар упадзе...

Штогод, 2 лютага, невялікі правінцыяльны гарадок з 10-тысячным насельніцтвам і немілагучнай назвай Punxsutawney, размешчаны ў заходняй частцы амерыканскага штата Пенсільванія, прыцягвае да сябе ўвагу ўсяго свету, бо мясцовыя жыхары абставілі паводзіны сурка ў цэлы рытуал. Намаганнямі рэдактара мясцовай газеты ў 1886 годзе быў створаны Клуб Сурка, пра які хутка даведалася ўся Амерыка, і паступова Дзень сурка стаў нацыянальным святам. Сурка Філа нават узвялі ў ранг Афіцыяльнага нацыянальнага прадказальніка надвор'я. На свята пачалі прыязджаць вядомыя палітыкі і зоркі шоу-бізнэсу. А самі прадказанні сталі агучвацца ў выпусках навін на самых буйных каналах ТБ і радыё краіны. У 1986 годзе сурок Філ атрымаў аўдыенцыю ў тагачаснага прэзідэнта ЗША Рональда Рэйгана, для чаго жывёле давялося ехаць у Вашынгтон. З нядаўняга часу цырымонія перамоў з сурком трансліюецца ў інтэрнэце, а сам сурок мае некалькі ўласных сайтаў.

Традыцыя перакладаць адказнасць за доўгатэрміновыя прагнозы надвор'я на жывёл пачалася яшчэ ў Старажытным Рыме, дзе 2 лютага адзначаўся Дзень вожыка. Метэаралагічны прагноз у гэты дзень будаваўся на аснове паводзін разбуджанага вожыка, які бачыў ці не бачыў свой цень. Жыхары Заходняй Еўропы захавалі гэтую традыцыю і ў больш познія перыяды. А перасяленцы ў Паўночную Амерыку захапілі яе з сабой. Па той бок акіяна, дзе вожыкі не вадзіліся, роля адказнага метэаролага перайшла да сурка.

Цікава, што гісторыя ўзнікнення свята мае дачыненне і да хрысціянства. 2 лютага па грыгарыянскім календары хрысціяне Еўропы адзначалі Грамніцы. Ужо тады надвор'е ў гэты дзень лічылі адказным за хуткасць набліжэння вясны. У Паўночнай Амерыцы да гэтага часу папулярная наступная прымаўка: «Калі на Грамніцы ясна і бязвоблачна — быць двум зімам у годзе».

**Цікава, што ў нас, на Беларусі, ёсць свае прыкметы адносна надвор'я на гэтую дату, цалкам процілеглыя амерыканскім. 2 лютага — Яўхімій. Калі на Яўхімія ў поўдзень ззяе сонца — чакай ранняй вясны. Калі мяцеліца — то снег будзе ісці яшчэ тыдзень.**

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

## «СІБІР» НА ПРЫПЯЦІ

Апошнія прыгатаванні да веснавога сезону ў Мазырскім рачным порце праходзіць ледакол з гучнай назвай «Сібір». Гэта судна прызначана для ломкі лёду і вызвалення водных шляхоў для суднаходства. Ледакол пабудаваны на базе буксіра, які быў спушчаны на ваду 30 год таму. Летась работнікі Рэчыцкага суднарамонтнага завода падарылі яму другое жыццё: адрамантавалі і значна ўзмацнілі абшыўку. Дзякуючы гэтаму судна зможа справіцца з тоўстым лёдам. Дарэчы, ў басейне ракі Прыпяць гэта адзінае судна, здольнае вырашаць праблемы папярэджвання веснавых надзвычайных сітуацый. Таму, хутчэй за ўсё, працы для яго сёлета будзе дастаткова, лічаць у Гомельскім абласным упраўленні МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



## АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

**Па гарызанталі:** Глобус. Грамыка. Дняпро. Палін. Мокша. Рух. Ландо. Раса. Мазурка. Зло. Цытра. Мара. Турнік. Іўе. Гомель. Шост. Рот. Рур. Катэт. Радар. Тар. Танк. Кіраса. Тарос. Воўк. Елка. Глянец. Атаманка. **Па вертыкалі:** Сталагміт. Шарапава. Мазыр. Нітрат. Курсіў. Ура. Буда. Кедр. Палац. Кравец. Свята. Рол. Люнет. Броўка. Горкі. Скат. Проза. Кок. Доза. Хром. Аперта. Істр. Лотас. Альт. Разетка.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.55 | 16.52 | 8.57 |
| Віцебск — | 7.50 | 16.36 | 8.46 |
| Магілёў — | 7.46 | 16.42 | 8.56 |
| Гомель — | 7.37 | 16.44 | 9.07 |
| Гродна — | 8.09 | 17.08 | 8.59 |
| Брэст — | 8.05 | 17.14 | 9.09 |

**Месяц**

*Маладзік 3 лютага. Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

**Пр.** *Рымы, Яфіма.*

**К.** *ГРАМНІЦЫ (Ахвяраванне Пана), Марыі, Аскара, Карнеля, Міраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 2 лютага

**Дзве даты**

**485 год** — нарадзіўся Ян Вісліцкі, паэт-лацініст, выхадзец з Беларусі. Скончыў Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве, атрымаў ступень бакалаўра, у 1510-12 гадах — магістр у ім. Аўтар од, эпіграм, элегіяй, пасланняў («Ода да караля Жыгімонта», «Элегія да Багародзіцы Панны Марыі», «Эпіграма на зайздросніка»). На гістарычным матэрыяле напісаў эпічную паэму «Пруская вайна», якая вылучаецца манументальнасцю батальных сцэн і мастацкім паказам прыроды (у другой частцы твора апісана Грунвальдская бітва 1410 г.). Паэма з'явілася родапачынальніцай эпапеі ў беларускай, польскай, літоўскай літаратуры. Памёр у 1520-х гг.



**1885 год** — нарадзіўся Міхаіл Васільевіч Фрунзе, рэвалюцыянер, савецкі ваенны і дзяржаўны дзеяч, ваенны тэарэтык, адзін з арганізатараў Савецкіх Узброеных Сіл. Да рэвалюцыі неаднаразова арыштоўваўся, быў двойчы прысуджаны да смяротнага пакарання, замененага пажыццёвай катаргай. З 1916 года — на Заходнім фронце, вольнанаёмны артылерыйскай часткі ў мястэчку Івянец, затым у Мінску ў камітэце Усерасійскага земскага саюза на Заходнім фронце. Стварыў у Мінска падпольную бальшавіцкую арганізацыю. Вёў рэвалюцыйную агітацыю на фронце, выступаў на мітынгах і падпольных сходах, арганізоўваў братанне салдатаў. Адзін са стваральнікаў Мінскага Савета, член яго выканкама, начальнік народнай міліцыі Мінску, дарэчы, адзін з першых рэдактараў газеты «Звязда». Быў намеснікам старшыні СНК УССР, старшынёй РВС СССР, наркамам па ваенных і марскіх справах СССР, начальнікам Ваеннай акадэміі РСЧА. Аўтар навуковых прац, якія аказалі ўплыў на развіццё савецкай ваеннай навукі і фарміраванне ваеннай дактрыны. У гады Вялікай Айчыннай вайны імя М. В. Фрунзе было прысвоена 5 партызанскім брыгадам і 22 партызанскім атрадам, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

**Цытата дня:**

***«Няма нічога больш сумнага, чым жыццё жанчын, якія ўмелі быць толькі прыгожымі».***

**Бернар дэ Фантэнель (1657—1756), французскі вучоны.**

**Настальгічная вандроўка**




# КАБ ТРАПІЦЬ У АКОПЫ, РЫХТУЙЦЕ ЛЫЖЫ!

(Карэспандэнт «Звязды» гэтай зімой стаў, бадай, першым і адзіным наведвальнікам славутай мясціны)

**ПАБЫВАЦЬ у Купалаўскіх Акопах мне даводзілася ва ўсе поры года і самыя розныя станы надвор'я: любаваўся гэтай мясцінай у час першых лясных кветак і яркай восеньскай пазалоты, сустракаў тут летнюю росную раніцу і праводзіць кароткі лістападаўскі дзень. Але зімовых Акопаў бачыць яшчэ не даводзілася. І вось нарэшце прычакаў, пакуль усталюецца адпаведнае надвор'е. Добра, што гэтая славутая мясцінка знаходзіцца не надта далёка ад сталіцы: прыблізна 25 кіламетраў да павароту на Харужанцы (дарога № 58 Мінск—Мядзел) і яшчэ кіламетраў 5-6 праз Карпілаўку і Харужанцы. Маляўнічы куточак, ведаю, вабіць многіх сталічных жыхароў: як-ніяк гэта ж цэнтр Беларускай Швейцарыі! Шмат разоў бачыў наведвальнікаў каля падмуркаў колішняга хутара. Тут спакой, спеў птушак, дыхаецца вольна. Прастора для вачэй, пагляд лашчаць магутныя дубы на паляне за агароджай і загадкавы лес на схілах Сухой гары. Камень-валун за драўлянай кладкай, на якім прымацавана мармуровая шыльда, здаецца, пасівеў ад сваёй даўніны. Тым, хто цікавяцца творчасцю Янкі Купалы, абавязкова трэба наведаць Акопы — месца найбольшага літаратурнага плёну песняра. На Лагойшчыне шмат прыгожых Купалавых мясцін, але гэты куток паэт любіў больш за іншыя. Можа таму і творчы акопаўскі вынік гэткі значны. Менавіта ў Акопах была завершана вясёлая п'еса «Паўлінка». Тут створаны і іншыя знакавыя п'есы — «Тутэйшыя», «Прымакі», «Раскіданае гняздо»; паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я», дзясяткі вершаў, пераклады. У Акопах з 1909 па 1926 гады жылі маці і сёстры паэта. Купала прыязджаў да іх на адпачынак з Вільні і Пецярбурга, нават атрымліваў па пошце газету «Наша ніва», вёў перапіску. На жаль, у савецкія часы Акопы ў Купалавай біяграфіі ніяк не згадваліся. Сам жа колішні фальварак знік і стаў часткаю лесу.**

Марозная раніца, шэрань, лагоднае сонейка — найлепшая падстава для вандровак і экскурсій. Але дабрацца да Акопаў аказалася справай не з простых. Дарогу ад вёскі Харужанцы, у якой знаходзіцца філіял літаратурнага музея, да Акопаў зімою ніхто не даглядае, не чысціць (усяго два кіламетры, як сведчыць дарожны ўказальнік). Толькі дзякуючы леснікам, якія недалёка ад урочышча рэжуць лес і прабілі свае каляіны, пераадолеў палову шляху. Другую, па бездаражы, правальваючыся па калені, рызыкнуў прайсці пешкі. Прайшоў метраў з трыста і ўжо пашкадаваў, што не прыхапіў лыжы — яны былі б вельмі дарэчы. Напэўна, шмат хто яшчэ жадаў наведаць зімовыя Акопы, але не адважыліся прабівацца па цаліне: адкуль ім ведаць пра адсутнасць дарогі ці нават якой-небудзь сцежкі. Хоць я і адчуваў сябе ў нейкай ступені першапраходцам, але хутка ўзмакрэлы ад напружанай хады, цёплага зімовага адзення і важкай фотаапаратуры, вялікай радасці не выпрабоўваў. Было жаданне вярнуцца ў Харужанцы, зайсці ў музей і запытацца: чаму зімою да Акопаў бездараж? Але гэткі настрой быў нядоўгі. Бо велічны стан лесу ў шэрай намітцы ды абсалютная цішыня рабілі сваю справу — перапаўнялі пачуцці і рухалі наперад. І цяпер я рады, што мая апантанасць была мацнейшай за часовыя і маленькія нязручнасці.



Акопы сёлета добра замецены, нават падмуркаў не бачна. Над белым покрывам снегу цямнеюць толькі зруб-муляж студні ды жэрдкі агароджы колішняга падворка з брамкай. Недзе з паўднёвага кута, з-за пагорка, да студні вядуць заечыя сляды. Яны пятляюць і знікаюць у раўчуку — там, дзе замецена кладачка і дрэмле пад снегам сівы валун. Цікава, здаецца нічога асаблівага ў гэткую пару ўбачыць нельга, а ў Акопах усё-роўна прыходзіць адчуванне, як быццам дакранаешся да нечага велічнага. Асаблівае месца! Таму раю ўсім наведаць яго нават зімой. Але на ўсялякі выпадак неабходна прыхапіць лыжы.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Лагойскі раён.*





**ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит торги по продаже недвижимого имущества ЗАО ПСК «Витстрой»**





**ПРОИЗВОДСТВЕННАЯ БАЗА, расположенная по адресу: г. Витебск, ул. 39-й Армии, 58,**

состоящая из: ангара общей площадью 939,3 кв.м; гаража с бытовыми помещениями общей площадью 85,8 кв.м; незавершенного строительством ангара общей площадью 903 кв.м.

**Площадь земельного участка – 0,9445 га.**

**Начальная цена 792 389 151 бел. руб. без учета НДС.**

**Контактные телефоны: (0212) 47 97 35, МТС 514 36 47. www.marketvit.by, vcm74@mail.ru.**

## ПРАЕКТА НЯМА. А ДЗЕ ГРОШЫ?

Дырэктар аднаго з кобрынскіх ААТ заключыў дагавор з мінскай фірмай на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі новага аб'екта. На рахунак праектантаў было пералічана 90 мільёнаў рублёў. Фірма рабіць праект не спяшалася, але кобрынскі заказчык чамусьці падпісаў акт здачы-прыёмкі дакументацыі. Усё б нічога, ды вышэйназваныя 90 мільёнаў былі бюджэтнымі грашыма, якія выдзяляліся на развіццё малых і сярэдніх гарадоў. Цяпер 43-гадоваму жыхару Кобрына давядзецца адказваць у адпаведнасці з законам.

**Яна СВЕТАВА.**

## ПІЛІ РАЗАМ З ДЗЕЦЬМІ

**У Віцебскай вобласці летась 401 грамадзянін быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за спойванне непаўналетніх.**

Як падкрэсліваюць кіраўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, работа па прафілактыцы такіх парушэнняў будзе ўзмацняцца. Многія сярод пакараных «штрафнікоў» куплялі спіртное незнаёмым дзецям па просьбе апошніх, сумесна распівалі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Усміхнемся

Жаночы спіс прымавак.

Зрабіў справу — гуляй з дзіцем.

Вынес смецце — не ўспамінай месяц.

Выпіў з сябрамі — начуеш у іх жа.

Злавілі з засосам — выхадныя з пыласосам.

Не даеў на вячэру, даясі на сняданак.

Рыхтуй мужыка ўлетку, каб было футра ўзімку.

Злавіла ў рэстаране — 2 тыдні ў Мілане.

Вучыш вадзіць — вучы вадзіць, а не гарлапань на мяне.

Са страшнай сяброўкай і ў клуб не страшна.

☺

**Тэлефонны званок:**

**— Алё! Гэта я ў морг трапіў?**

**— Не, пакуль толькі патэлефанавалі.**

☺

Сняжынка вагой 130 кілаграмаў прыціснула зайчыка на маскарадзе ў інтэрнаце хлебабулачнага камбіната.

☺

**Малодшы сын застаўся з татам на цэлы дзень. Увечары тата тэлефануе маці:**

**— Ён жудасна капрызны, увесь дзень ходзіць за мной і раве.**

**— Саша, а ты яго чым карміў у абед?**

**— ....????....Во! Яго ж трэба было пакарміць!...**

☺

Рыбак забыўся свой улоў у аўтобусе пад сядзеннем. Праз тры дні ў мясцовай газеце з'явілася аб'ява: «Хто пакінуў кошык з рыбай у аўтобусе № 47, можа зайсці ў гараж і забраць аўтобус».




# НЕ ПЛЮЙ У КАЛОДЗЕЖ!

**Калодзеж даволі часта станавіўся своеасаблівым удзельнікам як каляндарных, так і сямейна-родавых абрадаў.**

● У славян быў шырока распаўсюджаны наступны звычай: пасля вяселля нявеста павінна была ўпершыню набраць вады з калодзежа ў прысутнасці гасцей — такім чынам, адбывалася яшчэ адно яе абрадавае «ўжыўленне» ў сям'ю мужа. Прычым госці павінны былі ўсяляк перашкаджаць ёй, не пускаць да калодзежа. На Беларусі існавала правіла: калі нявеста ўпершыню брала ваду ў калодзежы сваёй новай сям'і, то яна павінна была пакласці на зруб невялікі кавалачак вясельнага каравая і кінуць у калодзеж манету. Для таго, каб сямейную пару ніхто не разлучыў, у дзень вяселля закрывалі замок, ключ ад якога кідалі ў калодзеж.

● На Каляды калодзеж станавіўся цэнтрам дзявочай варажбы. Напрыклад, у ноч на Раство Хрыстова дзяўчына закрывала калодзеж на замок, ключ клала пад падушку і загадвала, каб у сне «суджаны прыйшоў вады папіць».

● У памінальныя дні калодзежы былі месцам, куды абавязкова прыносілі крыху рытуальнай ежы. Часам яе нават кідалі ў калодзеж, часцей — пакідалі на ўсю ноч на зрубе калодзежа. Часам ён выступаў і як «рытуальная магіла». Калі ў сям'і не «гадаваліся» дзеці, бабка-павітуха «закрывала» смерць на замок, які клала ў труну з памерлым дзіцем, а ключ кідала ў калодзеж. А на Тройцу, як і ўсе пабудовы ў гаспадарцы, калодзежы ўпрыгожвалі зелянінай, вянкамі з кветак і траў. Лічылася, што калодзеж, які мае сувязь з «тым» светам, здольны пазбаўляць ад хвароб і выконваць жаданні. Асаблівай лекавай сілай валодала калодзежная вада напярэдадні Раства Хрыстова (6 студзеня), Хрышчэння (18 студзеня), Стрэчання (14 лютага). Вадой, узятай у гэты дзень ранкам, мыліся, паілі хворых, купалі дзяцей і г. д.

● Ваду, узятую з калодзежа «па ўсіх» правілах, замаўлялі і лячылі ёю сурокі. У калодзеж кідалі рэчы, на якія «адсылалі» свае немачы — напрыклад, гарох, зерне ячменю (пры лячэнні «ячменю» на вачах) і г. д.

● Вада, узятая не з аднаго, а з некалькіх калодзежаў, лічылася асабліва гаючай. Так, знахары, якія выкарыстоўвалі калодзежную ваду, прасілі браць яе з трох, сямі ці дванаццаці калодзежаў. Лічылася, каб павялічыць колькасць малака ў каровы, яе неабходна напаіць вадой з трох калодзежаў. Для выпечкі вясельнага каравая ваду таксама бралі з сямі калодзежаў.

● Цікава, але цудадзейнымі якасцямі валодала і трава, якая расла побач з калодзежам. Яе давалі як корм хатняй жывёле для пладавітасці.

● У славян шырока распаўсюджана павер'е, што ў кожным калодзежы жыве дух-ахоўнік — калодзезнік. Каб задобрыць яго, адзін раз на год — у Ільін дзень (2 жніўня) раніцай, калі бралі першае вядро вады з калодзежа, на дно вядра клалі лісце мяты. На Юрая Зімовага (9 студзеня) «слухалі» ваду ў калодзежы. Калі яна была спакойная — чакай цёплую зіму, калі ж з калодзежу даносіліся гукі — трэба было спадзявацца на моцныя маразы і завеі.

● У народнай культуры калодзежы і вада з іх заўсёды былі надзелены статусам святасці. Лічылася, што калодзежы знаходзяцца пад аховай Багародзіцы і святой Параскевы Пятніцы. Нездарма казалі: «Не плюй у калодзеж, давядзецца вады напіцца». Гэты фразеалагізм можна разумець як у пераносным, так і ў прамым сэнсе.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 523. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12